## V. НАЦИОНАЛЬНЫЕ ФОРМЫ ЛИТЕРАТУРЫ, ИСКУССТВА, ДИЗАЙНА В МЕЖКУЛЬТУРНОМ ВЗАИМОДЕСТВИИ

# ВАЕННЫ ДЫСКУРС І ЎПЛЫЎ МАСТАЦКА-КУЛЬТУРНАЙ ПРАКТЫКІ М. ГАРЭЦКАГА НА АЙЧЫННУЮ АПОВЕСЦЬ

**Т. Р. Багарадава**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, гуманітарны факультэт,
зав. Стралецкі, 4, 211415, г. Полацк, Рэспубліка Беларусь
e-mail: bogoradova1974@yandex.ru

У артыкуле атаясамліваецца праблема адлюстравання ваеннага дыскурсу ў жанры беларускай аповесці і яе мастацка-культурнае ўвасабленне ў творчай практыцы М. Гарэцкага, а таксама разглядаецца ўплыў пісьменніка на айчынны літаратурны кантэкст, падкрэсліваюцца сувязі аўтара з практыкай рускіх і замежных майстроў слова ў дачыненні да спосабаў асэнсавання ваеннай рэчаіснасці.

*Ключавыя словы*: «індывідуальнае сумленне», псіхалагізм, аксіялагічныя каштоўнасці, «лейтэнанцкая проза», эстэтыка.

# THE WAR DISCOURSE AND THE IMPACT OF THE ARTISTIC AND CULTURAL PRACTICE OF M. HARETSKI ON THE NATIONAL SHORT NOVEL

**T. R. Baharadava**
Polotsk State University, Humanities Department,
Stralecky Lane 4, 211415, Polack, Republic of Belarus
e-mail: bogoradova1974@yandex.ru

The article deals with the reflection of the war discourse in the genre of the Belarusian short novel and its artistic and cultural expression in the creative practice of M. Haretski. The author considers the influence of the writer on the national literary context, emphasizes the connections with the practice of Russian and foreign writers in the respect of methods of understanding and reflection of the war reality.

*Key words:* ‘individual conscience’, psychologism, axiological values, ‘Lieutenant prose’, aesthetics.

Айчынная літаратура рэалізавала эвалюцыйнае адлюстраванне ваенных падзей у жанры аповесці менавіта на прыкладзе аўтабіяграфічнай прозы, што задала адну з тэндэнцый — максімальна дакладнае ўзнаўленне вайны, у справе якой мае вялікае значэнне асабісты вопыт удзельніка. Тыя пісьменнікі, што звярталіся да ўлас-

нага вопыту, дасягнулі праўдзівага мастацкага і эстэтычнага адлюстравання вайны. «У пэўнай ступені можна нават гаварыць аб аўтабіяграфізме ваеннай прозы. Перажытасць матэрыялу пісьменнікамі праявілася <…> і ў шматлікіх пазіцыях формы» [1, с. 8—9].

Біяграфія пісьменніка ў дачыненні да мастацкага дыскурсу адлюстравання праблем ваеннага часу мае выключнае значэнне. «Яна напаўняе яе падзейна, вобразна, насычае духоўна і эмацыянальна. І чым больш багатая яна на падзеі, на душэўныя перажыванні, на высокія памкненні духу, тым больш жыццёвай, праўдзівай, разнастайнай па тэматыцы, па вобразнай сістэме, больш шчырай і пераканальнай эмацыянальным ладам будзе творчасць» [2, с. 9]. Беручы пад увагу біяграфію пісьменіка, трэба ўлічваць гістарычны кантэкст яе фармавання, прыроду, змястоўную сутнасць.

Творчасць М. Гарэцкага (1893—1938) у галіне малых форм і жанру аповесці з'яўляецца прыкладам адлюстравання біяграфічнага пачатку праз кантэкст ваеннага часу не толькі ў айчынным пісьменстве. Яна стала лаканічным працягам назапашанага сусветнага вопыту ў літаратуры пра вайну. Па словах Э. Іофе: «Ужо ў самым пачатку творчага шляху Максім Гарэцкі паказаў сябе даволі эрудыраваным пісьменнікам, які добра ведаў творчасць такіх волатаў літаратуры рускага, украінскага і польскага народаў, як Пушкін і Гогаль, Л. Талстой і Дастаеўскі, Шаўчэнка і Міцкевіч, глыбока разумеў іх выключную ролю ў духоўным жыцці сваёй нацыі, востра адчуваў чарговыя патрэбы літаратурнага развіцця беларусаў» [3, с. 30].

Адносна беларускага кантэксту пры паказе ваенных падзей варта прыгадаць адлюстраванне пісьменнікам тэмы свабоды ў розных праявах — індывідуальнай і народнай. Першая ўвасобілася ў дакументальна-мастацкіх запісках «На імперыялістычнай вайне» (поўная назва «На імперыялістычнай вайне. Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы») (1914 —1915, 1919, 1925, 1926). Другая — у «вялікім эпасе» аўтара, рамане-хроніцы «Камароўская хроніка» (1930 — 1932 — 1937, апублікаваная ў 1966).

Герой М. Гарэцкага — Лявон Задума — асоба самавызначальная, якая атаясамлівае сябе ў акаляючым свеце. У творчасці пісьменніка можна знайсці ўплывы мастацкай практыкі Л. Талстога і Ф. Дастаеўскага (спасціжэнне дыялектыкі душы). Не без падстаў гучыць і выснова А. Адамовіча адносна творчай практыкі М. Гарэцкага ў супастаўленні з вопытам А. Чэхава (наступны этап рускага рэалізму ў класічным сцвярджэнні).

Ідэя «індывідуальнага сумлення», якую прапагандуе М. Гарэцкі ўслед за Ф. Дастаеўскім, займае першаснае месца ў «вялікім эпасе» аўтара: *У думках маіх пранеслася, як аднойчы, гуляючы за горадам, я <…> ўбачыў сабаку, які паміраў. Вочы ў таго сабакі былі, як і ў чалавека, калі ён вельмі пакутуе ад болю і безнадзейнасці, адчуваючы, што <…> гэта смерць <…>. Такі ж погляд кінуў на мяне зараз і Таўстоў, бамбардзір <…> першай гарматы <…>. Гэтая смерць цяжка ўразіла мяне <…>* [4, с. 231].

Наватарскае значэнне «Запісак…» заключаецца і ў тым, што твор стаіць ля вытокаў жанру беларускай мастацкай дакументалістыкі. Адначасова прасочваюцца мастацкія, эстэтычныя, культурныя ўплывы і паралелі: «Твор пастаўлены крытыкай і даследчыкамі ў адзін шэраг з «Севастопальскімі апавяданнямі» (1855) і «Вайной і мірам» (1863 —1869) Л. Талстога, аповесцямі і раманамі А. Барбюса, А. Цвейга, Э.-М. Рэмарка і іншых таленавітых і непараўнальных сусветных майстроў вайсковай прозы» [5]. Атаясамліваючы значэнне дадзенага твора ў кантэксце пошукаў праўды пра ваеннае быццё, варта прыгадаць выказванне І. Чыгрына: «Што Максім Гарэцкі адкрыў? <…> Праўду пра свой народ. Парадаксальна, але так: пішучы пра вайну, якую вядуць арміі дзвюх імперый, стварыў праўдзівыя творы пра ўласны народ» [6, с. 69]. Такім чынам, М. Гарэцкі ў айчыннай літаратуры ўкараняе і пашырае традыцыі, назапашаныя сусветнай класікай у галіне рэалізму.

Кажучы пра ўвасабленне мастацкага вопыту М. Гарэцкага ў айчынным літаратурна-культурным полі, адзначым, што адлюстраванне народнай свядомасці знайшло свой лагічны працяг у творчай спадчыне К. Чорнага (1900—1944): раманах «Сястра» (1927—1928), «Зямля» (1928), аповесці «Лявон Бушмар» (1929) і пазнейшых творах аўтара, заканчваючы недапісанай «ваеннай» аповесцю «Скіп'ёўскі лес» (1941—1944).

У мастацкай спадчыне пісьменніка, прысвечанай ваеннай тэматыцы, выразна адчуваецца багацце вопыту, назапашанага аўтарам у 1920—1930-я гг. Ваеннае быццё раскрываецца пісьменнікам праз апасродкаванае ўзнаўленне рэчаіснасці, бо К. Чорны не меў уласнага ваеннага вопыту. Быццё — макракосм, які складаецца з мікракосмаў — жыццяў асобных людзей. Героі К. Чорнага ў большасці сваёй — жыццялюбы. Напрыклад, *Кастусь Прыбыткоўскі з аповесці «Скіп'ёўскі лес» вельмі тонка і філасафічна ўспрымае межы жыцця і смерці: Кастусь Прыбыткоўскі ў гэты апошні момант меў адчуванне, падобнае*

*да адчування смертніка, які ведае, што сваёй смерцю ён выратуе тых, хто яму даражэй за ўласнае жыццё* [7, с. 439].

Важным момантам з'яўляецца апісанне псіхалагічнага стану шарговага салдата ў хвіліны забойства ворага. Тэма, распачатая ў «Запісках...» М. Гарэцкага, плённа працягнутая і дэталізаваная ў К. Чорнага. Калі ў М. Гарэцкага Лявон Задума з гэтай нагоды адчувае агіду, дык у К. Чорнага Кастусь Прыбыткоўскі ўсведамляе нянавісць да ворага, загартоўваючы сябе дзеля змагання. У гэтым бачыцца працяг заходняй класічнай традыцыі адлюстравання ваенных падзей, дзе вайна з'яўляецца натуральным станам мужчыны. Чалавек — частка народа і чалавецтва, а яго лёс — частка агульнанароднага лёсу. У герояў пісьменніка асабліва востра праяўляецца пачуццё любові да Радзімы менавіта ў перыяд вайны. Кажучы пра мастацка-эстэтычныя ўплывы ў беларускай літаратуры, варта адзначыць, што стваральнікамі нацыянальнай рэалістычнай прозы сталі М. Гарэцкі і К. Чорны. «Аналітыка-рэалістычнага яе накірунку (М. Гарэцкі) і рэалістычна-псіхалагічнага (К. Чорны)» [8, с. 8-9].

Такім чынам, у літаратурным развіцці кожнай эстэтычнай школы, накірунку, пісьменніцкага генезісу адбываюцца працэсы асіміляцыі, дэфармацыі і трансфармацыі творчых прынцыпаў, якія былі распрацаваны мастакамі папярэдніх перыядаў. Я. Колас побач з Я. Купалам «сцвердзілі сваю, новую школу ў развіцці нацыянальнай літаратуры. Разам з празаікамі-рэалістамі М. Гарэцкім і К. Чорным <...>. Яны сталі здабыткам ужо агульнага працэсу, страцілі прыкметы індывідуальнага стылю і набылі якасці тыпалагічна вызначальных прынцыпаў. <...> І для сучаснікаў, і для наступных пакаленняў яны сталі тым жыццядайным пачаткам, які ў значнай ступені паўплываў на змест і структуру іх твораў» [8, с. 5—6].

«Запіскі...» займаюць асобае месца не толькі ў гісторыі беларускай літаратуры, але і ў сусветным мастацка-культурным полі. Кніга з'яўляецца прынцыпова новым этапам як у атаясамліванні ваеннай праблематыкі з улікам аўтабіяграфічнага пачатку, так і эвалюцыяй ідэйнай пазіцыі М. Гарэцкага: аўтабіяграфізм крытычна-рэалістычны, пераканаўчае апісанне праўды вайны (такое апісанне ваенных падзей, кажучы пра традыцыі і літаратурныя сувязі, знойдзе лагічны працяг у творчасці В. Быкава), фіксацыя патаемных зрухаў чалавечай душы (псіхалагічны стан не толькі шэраговага ўдзельніка вайны — салдата, — але і масы людзей).

У мастацкай практыцы В. Быкава (1924—2003) працягнуты менавіта аб'ектывавана-дакументальны накірунак творчасці М. Гарэцкага. Творы В. Быкава да 1970-х гг. (да аповесці «Сотнікаў» (1970) блізкія вопыту пісьменніка сваім адлюстраваннем паглыбленага псіхалагізму вайны, прапушчанага праз асабістае ўспрыманне шараговага яе ўдзельніка. У творчасці абодвух аўтараў пры раскрыцці характараў-тыпаў варта знаходзіць уплывы псіхалагізму Л. Талстога, з «Вайной і мірам» якога В. Быкаў «прайшоў праз усю вайну» [8, с. 9].

Эстэтыка і навацыі М. Гарэцкага з'явіліся адным з эвалюцыйных падмуркаў для стварэння «лейтэнанцкай прозы». У беларускай літаратуры В. Быкаў пашырыў і ўдасканаліў іх, бо яго герой вызначаецца глыбінёй характару, дамінантай маральнага пошуку і выбару («Сотнікаў» (1970), «Дажыць да світання» (1972), «Знак бяды» (1982), «Аблава» (1989), «Сцюжа» (1969, 1991) і інш.). Герой-інтэлігент В. Быкава (настаўнік Мароз) як прадстаўнік савецкай школы ідзе да немцаў з мэтай падтрымаць у сваіх выхаванцаў дух веры ў людзей. У гэтым зноў жа бачацца паралелі з «талстоўскім» светаўспрыманнем: герой В. Быкава — асоба больш рэфлексійная, самадастатковая. Выказванне, адрасаванае У. Конанам героям прозы В. Быкава, арганічна падыходзіць і да характарыстыкі вобразаў, створаных творчасцю М. Гарэцкага: «<...> Гэта традыцыйна беларускія характары, выяўленыя не толькі пісьменнікам, але і ў ягонай чалавечай асобе. Яны пакутніцкія, але ў гэтым пакутніцтве гартуюцца ваяры духу, за якімі — будучыня» [9, с. 25].

Нервовая дваістасць герояў М. Гарэцкага блізкая мастацкай практыцы М. Стральцова (1937—1987), у аповесці якога знаходзім рэтраспектыўнае адлюстраванне псіхалагічнага стану героя пасля перажытага на вайне. Вобразы пісьменніка ў многім суб'ектыўныя, больш лірычныя: аўтар прапускае апісанне падзей праз настрой, асабіста перажытые і адчутае. Рэаліі рэчаіснасці служаць адзінай мэце — перадаць зрухі пачуццяў мастака. Стыль аўтара напружаны: адчуваецца неспакой, унутраны канфлікт і пісьменніка, і яго героя: *Ён увабраў галаву ў плечы, не зважаючы, што непрыемна-холадна дакранаўся да шчакі зледзянелы матузок ад аблавушкі, і — глядзеў...* [10].

Побач са шматлікімі творамі замежных аўтараў пра першую і другую сусветную вайну, якія стварылі шырокі спектр літаратурных герояў, вобраз Пятра Шапятовіча з пенталогіі І. Шамякіна (1921—2004) «Трывожнае шчасце» (1956—1963) у айчыннай літа-

ратуры супастаўляльны з вобразам Лявона Задумы з цыклу твораў М. Гарэцкага. «Узмацненне дынамікі сацыяльных супрацьлегласцей абвастрае пытанні каштоўнасна-сэнсавага самавызначэння <…> грамадзян» [11]. У творах абодвух аўтараў ад асобы галоўнага героя распавядаецца пра натуралізм ваеннай рэчаіснасці, паказваецца змена аксіялагічных арыентацый маладога чалавека, прапагандуюцца маральныя каштоўнасці.

Трэба адзначыць, што станаўленне Пятра Шапятовіча як сацыяльна і грамадзянска значнай асобы адбываецца дастаткова запаволена, бо яго маральнае сталенне, у адрозненне ад героя М. Гарэцкага, замыкаецца на асабістых калізіях: яно канчаткова адбудзецца толькі ў ваенны перыяд. «Ваеннае жыццё не перайначыла характар Пятра Шапятовіча, але яно з'явілася як бы каталізатарам, які паскорыў працэс яго станаўлення як сацыяльна і духоўна значнай асобы. Шапятовіч сур'ёзна пачынае задумвацца над супярэчлівымі пытаннямі быцця <…>» [12, с. 12—13].

Аксіялагічныя арыентацыі асобы ў аповесці І. Шамякіна (таксама, як і ў творах М. Гарэцкага) выражаюцца праз мэты, ідэалы, інтарэсы, жыццёвыя планы, прынцыпы, перакананні, з'яўляюцца ўтварэннем ідэйна-мэтавага плана, генеральнай лініяй чалавечага жыцця. Сваю праяву яны знаходзяць у вербалізаваных праграмах і рэальных паводзінах персанажаў. Аналізуючы ўчынкі герояў М. Гарэцкага і І. Шамякіна, пра сацыяльна-палітычную пазіцыю, пра маральны свет асобы можна меркаваць па тым, на дасягненне якіх каштоўнасцей, у тым ліку, яна накіроўвае свае памкненні.

Распачатая М. Гарэцкім літаратурная практыка адлюстравання ваенных падзей у форме дзённіка паспяхова працягнутая ў трэцяй аповесці пенталогіі — «Агонь і снег» (1958), — найбольш паказальнай у сувязі з акалічнасцямі праўдзівага адлюстравання вайны. Форма дзённіка дае падставу казаць пра асаблівую праўдзівасць паказу абставін і працяг традыцый беларускай аўтабіяграфічнай прозы М. Гарэцкага, бо ў дадзенай частцы І. Шамякін таксама звяртаецца да «акопнай» тэмы, шараговых салдацкіх будняў: *Страх, агідны, ганебны страх, які я перажываў у першым баі <…>. У чаканні залпу ўсё адно дрыжэў, напружана звінеў у целе кожны мускул, кожны нерв* [13, с. 233].

Кажучы пра мастацкую спадчыну Я. Брыля (1917—2006), трэба адзначыць ролю эстэтычнага вопыту Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, М. Багдановіча, З. Бядулі, М. Гарэцкага ў яго творчай практыцы.

Мастацкая спадчына апошняга была пісьменніку найбольш даспадобы: вялікае хваляванне выклікаў урывак з апавядання «Роднае карэнне» (1913), у бібліятэцы ў ліку нешматлікіх на той час кніг была «Рунь» (1914). Пісьменнік удзельнічаў у сваім першым спектаклі па п'есе «Атрута», пастаўленай паводле драматычнага абразка з аднайменнай назвай, выдадзенай ў 1913 г.

Асэнсоўваючы сродкі адлюстравання ваеннай рэчаіснасці Я. Коласам у жанры аповесці, прыгадаем твор «Дрыгва», надрукаваны ў 1933 г. Аповесць заснаваная на рэальных фактах, апісвае падзеі часоў белапольскай акупацыі часткі тэрыторыі Беларусі ў 1919—1920 гг. Цэнтральны вобраз твора — беларускі селянін дзед Талаш. У свае ўжо немаладыя гады ён далучыўся да рэвалюцыйнай барацьбы, узначаліў партызанскі атрад, які ваяваў супраць польскіх войск на Палессі.

Нягледзячы на ўяўную прастату і дэтэктыўна-рамантычны сюжэт, аповесць не пазбаўленая філасафічнасці. Філасофскім у аповесці падаецца і пытанне ўнутранага пераўвасаблення дзеда Талаша з фігуры даволі несвядомай у асобу, якая падтрымлівае новы лад жыцця, разбіраючыся ў яго калізіях. Наогул, пераўвасабленне «<…> Іграе вялікую ролю ў жыцці чалавека. Гэта функцыя яго быцця» [14, с. 162]. Метамарфоза галоўнага героя ў дадзенай аповесці — крыху іншага кшталту, чым, напрыклад, у М. Гарэцкага, бо можна паставіць пад сумненне акалічнасць даволі непрацяглага пераасэнсавання і новага ўспрымання рэчаіснасці такім сталым чалавекам, як дзед Талаш.

Такім чынам, пачынаючы з М. Гарэцкага, уся рэалістычная літаратура пра вайну (К. Чорны, Я. Брыль, В. Быкаў, а таксама А. Адамовіч, В. Казько) базавалася на талстоўскім вымярэнні па крытэрыях канкрэтнай праўды і адкрытасці. Па словах А. Адамовіча, менавіта гэтая талстоўская мера праўдзівасці і маральнасці «<…> служыла для шматлікіх літаратур і пісьменнікаў выратавальнай мерай — для тых, хто адрываўся ад рэальнасці, або, наадварот, апускаўся ў яе бруд <…>» [15, с. 131]. Трэба дадаць, што М. Гарэцкі стаіць ля вытокаў эпасу, адной з галоўных ідэй якога стала вызначэнне паняццяў асобы і індывідуальнай свядомасці. Яны з'явіліся першапачаткова вымі ў пабудове эстэтыкі В. Някрасава, пазней ў беларускай літаратуры — В. Быкава, А. Адамовіча, В. Казько. Так, В. Быкаў не раз падкрэсліваў, што яго цікавіць у першую чаргу «<…> не сама вайна, <…> але галоўным чынам унутраны свет чалавека, магчымасці яго духу»

[16, с. 3]. Менавіта М. Гарэцкі, пазней В. Быкаў, а ў замежнай літаратуры Р. Олдзінгтон і асабліва Э. Хэмінгуэй з пэўнымі намаганнямі, але захавалі паняцце асобы.

Творы пісьменніка эстэтычна доўгатэрміновыя, бо ў іх адлюстравана праўда пра час і чалавечае быццё, якія асэнсоўваюцца з пазіцый народных інтарэсаў і гістарычнай будучыні. У гэтым несумненная каштоўнасць вопыту М. Гарэцкага для сучаснай літаратуры. Праблемы, якія пастаўлены ім, актуальныя і злабадзённыя для свайго часу. Яны атрымалі выхад у будучае, а пісьменніцкая канцэпцыя набыла аптымістычнае гучанне.

## Літаратура


1. Локун, В. І. Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950–1960-я гг. / В. І. Локун. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 109 с.
2. Андраюк, С. Творчасць і біяграфія / С. Андраюк // Роднае слова. – 2008. – № 3. – С.7 – 10.
3. Іофе, Э. Р. Максім Гарэцкі – беларусазнаўца / Э. Р. Іофе // Роднае слова. – 2013. – №2. – С. 30.
4. Горецкий, М. Избранное / М. Горецкий. – Минск : Мастацкая літаратура, 1989. – 544 с.
5. Максімава доля [Электронны рэсурс] // Бібліятэка гістарычных артыкулаў. – 2006. – Рэжым доступу: http://www.jivebelarus.net/at_this_day/birth-of-maksim-haretski.html. – Дата доступу: 02.02.2018.
6. Чыгрын, І. П. Паміж былым і будучым: проза Максіма Гарэцкага / І. П. Чыгрын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 167 с.
7. Чорны, К. Збор твораў: у 6 т. / К. Чорны. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. – Т. 6: Раманы, аповесці. – 464 с.
8. Локун, В. І. Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В. І. Локун. – Мінск : Тэхнапрынт, 2005. – 228 с.
9. Конан, У. Праблема дабра і зла ў творчасці В. Быкава / В. Быкаў // Крыніца. – 1996. – № 3. – С. 25.
10. Стральцоў, М. Адзін лапаць, адзін чунь [Электронны рэсурс] / М. Стральцоў // Belarusianreading. – 2015. – Рэжым доступу: https://belarusianreading.wordpress.com/2015/08/23/straltsou-adzin-lapaz-adzin-chun/. – Дата доступу: 29.01.2018.
11. Федосова, И. В. Проблема ценностных ориентаций в научной литературе [Электронный ресурс] / И. В. Федосова // Психология. – 2015. – Режим доступа: http:// Downloads/problema-tsennostnyh-orientatsiy-v-nauchnoy-literature. – Дата доступа: 19.01.2018.

12. Локун, В. І. Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950–1960-я гг. / В. І. Локун. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 109 с.
13. Шамякін, І. Трывожнае шчасце / І. Шамякін. – Мінск: Оракул, 1995. – 608 с.
14. Докучаев, И. И. Ценность и экзистенция. Основоположения исторической аксиологии культуры / И. И. Докучаев. – СПб. : Наука, 2009. – 595 с.
15. Адамович, А Толстовские традиции в литературе о войне / А. Адамович. – М., 1982. – 456 с.
16. Быкаў, В. Праўдай адзінай : Літ. крытыка, публіцыстыка, інтэрв'ю / В. Быкаў – Мінск : Маст. літ., 1984. – 262 с.

## ПОПУЛЯРИЗАЦИЯ ГЕРМАНО-СКАНДИНАВСКОЙ МИФОЛОГИИ В СОВРЕМЕННОЙ КУЛЬТУРЕ

**А. С. Беловская**
Белорусский государственный университет,
факультет социокультурных коммуникаций,
ул. Курчатова, 5, 220108,
Минск, Республика Беларусь
e-mail: Kult-16@mail.ru

В данной статье рассматривается влияние германо-скандинавской мифологии на культуру, в частности на современный кинематограф. Прослеживается популяризация скандинавской тематики с помощью литературы и кино, а также осуществляется сравнительный анализ германо-скандинавской и славянской мифологий.

*Ключевые слова*: популяризация, германо-скандинавская мифология, Старшая Эдда, Младшая Эдда, Дж. Р. Р. Толкин, сериал «Викинги».

## POPULARIZATION OF NORSE MYTHOLOGY IN MODERN CULTURE

**A. S. Belovskaya**
Belarusian State University, Sociocultural Communications Department,
Kurchatov St. 5, 220108, Minsk, Republic of Belarus
e-mail: Kult-16@mail.ru

This article examines the influence of Norse mythology on culture, in particular, on modern cinematography. The popularization of the Scandinavian subjects with the help of literature and cinema is traced, as well as a comparative analysis of the Norse and Slavic mythology is carried out.

*Key words*: popularization, Norse mythology, Poetic Edda, Prose Edda, J. R. R. Tolkien, TV series «Vikings».